*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

12 ЧЭРВЕНЯ 2007 г. АЎТОРАК

№ 107 (25972)

Кошт 350 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.



Фота БЕЛТА.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

## «СНД ПАВІННА ПАВЫШАЦЬ СВАЮ ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ ПРАЗ РЭАЛІЗАЦЫЮ КАНКРЭТНЫХ МАШТАБНЫХ ПРАЕКТАЎ»

**СНД павінна быць не проста захавана, яна павінна развівацца, павышаючы сваю эфектыўнасць як інтэграцыйнае аб'яднанне праз рэалізацыю канкрэтных маштабных праектаў. Такую нязменную пазіцыю беларускага боку Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка пацвердзіў 10 чэрвеня ў час абмену думкамі ў рамках нефармальнай сустрэчы кіраўнікоў дзяржаў СНД у Санкт-Пецярбургу, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

Энергетыка, транспарт і транзіт грузаў, міграцыя рабочай сілы, сумесныя праекты ў навуцы і адукацыі, умацаванне культурных сувязяў, стварэнне буйных міжнародных прамысловых холдынгаў і карпарацый, міжрэгіянальнае супрацоўніцтва і супрацоўніцтва паміж міністэрствамі і ведамствамі — вось пералік асноўных напрамкаў, па якіх неабходна актывізаваць узаемадзеянне паміж дзяржавамі — членамі Садружнасці, лічыць беларускі бок.

На нефармальным саміце ў паўночнай сталіцы Расіі прысутнічалі ўсе 12 лідараў краін Садружнасці.

Адным з цэнтральных пытанняў сустрэчы стала тэма развіцця і рэфармавання СНД. У Садружнасці была ўтворана міждзяржаўная рабочая група на ўзроўні намеснікаў кіраўнікоў знешнепалітычных ведамстваў, якая па даручэнню прэзідэнтаў да 1 чэрвеня падрыхтавала праект канцэпцыі далейшага развіцця СНД. Дакумент унесены на абмеркаванне кіраўнікоў дзяржаў.

У сувязі з тым, што пецярбургскі саміт меў нефармальны характар, канчатковы варыянт канцэпцыі плануецца разгледзець на афіцыйным пасяджэнні кіраўнікоў дзяржаў Садружнасці 5—6 кастрычніка ў Душанбе.

Прэзідэнты пацвердзілі намер прадоўжыць інтэграцыйныя працэсы ў рамках Садружнасці.

Кіраўнікі дзяржаў умовіліся кожны год акцэнтаваць увагу і выдзяляць з іншых адно найбольш важнае, прыярытэтнае пытанне, па якім будзе прымацца кансэнсуснае рашэнне. Першым пытаннем Казахстан унёс праблему міграцыі, у сувязі з чым будзе падрыхтаваны адпаведны дагавор СНД. Як было адзначана, працоўныя рэсурсы Садружнасці складаюць 130 млн чалавек. 10 працэнтаў — гэта мігранты, у ліку якіх і незаконныя.

У будучым годзе саміт СНД, як чакаецца, разгледзіць праблему транспарту і камунікацый, затым энергетыкі і адукацыі.



# СПЯКОТНАЕ ЛЕТА

*Слесар-зваршчык аўтобусных кузаваў Мінскага аўтамабільнага завода Аляксандр Карабко з дзевяцімесячным сынам Данілкам на адпачынку ў наднёманскай вёсцы Магільна Уздзенскага раёна.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## Гэта лета абяцае быць самым гарачым за стогадовы перыяд метэаназіранняў

Паводле ацэнкі **начальніка службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Дзмітрыя РАБАВА**, спёка, што ўсталюецца ў Беларусі ў другой дэкадзе чэрвеня, будзе на 4-5 градусаў вышэйшая за кліматычную норму. Калі ў першай дэкадзе месяца яна была на 3,1 градуса вышэйшая, то ў другой — чакаецца яшчэ больш гарачая.

У цэлым, паводле ацэнкі Брытанскага і Нямецкага гідраметэаралагічных цэнтраў, гэта лета абяцае быць самым гарачым за стогадовы перыяд метэаназіранняў. Сярэдняя тэмпература ў першай дэкадзе чэрвеня склала 18,6 градуса цяпла. У пачатку чэрвеня такіх сярэдніх значэнняў тэмпература дасягае на большай частцы тэрыторыі рэспублікі прыкладна раз у 7—10 гадоў, толькі на ўсходзе краіны — раз у 5 гадоў.

***(Заканчэнне на 3-й стар.)***

Падпіска-2007

## СА «ЗВЯЗДОЙ» — У НОВАЕ ПАЎГОДДЗЕ

**ІДЗЕ ПАДПІСКА НА 3-І КВАРТАЛ І ІІ ПАЎГОДДЗЕ 2007 ГОДА.**
**ПАДПІСНЫЯ ЦЭНЫ НА ГАЗЕТУ «ЗВЯЗДА»**
**(у рублях, устаноўлены з 01.07.2007 г.)**

| *Індэкс* | *на 1 месяц* | *на 3 месяцы* | *на 6 месяцаў* |
|---|---|---|---|
| **63850 (індывідуальны)** | **8200** | **24600** | **49200** |
| **63145 (індывідуальны льготны, для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны)** | **7850** | **23550** | **47100** |
| **63858 (ведамасны)** | **13000** | **39000** | **78000** |
| **63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя)** | **11850** | **35550** | **71100** |

**СПАДЗЯЁМСЯ НА ВАШУ ПАДТРЫМКУ, паважаныя падпісчыкі і работнікі паштовай сувязі.**

## Мы едзем!

**І, зразумела ж, ведаем, да каго і куды. Найперш — да спадарыні Юргілевіч з горада Дзятлава, якая, прачытаўшы ў газеце, што выйграла суперпрыз, стала ў кожным нумары шукаць абвяржэнняў: маўляў, так і так — прабачце, памылка выйшла...**

Адказалі раней, а цяпер і даказаць гатовы, што ўдача ўсміхаецца.

Заўтра, 13 чэрвеня, у 10.00 дзень падпісчыка газеты «Звязда» распачнецца ў Стоўбцах, у 13.00 — у Баранавічах, у 17.00 — у санаторыі «Радон», дзе працавала наша шаноўная ўладальніца халадзільніка. Назаўтра, наш маленькі звяздоўскі дэсант плануе сустрэцца з падпісчыкамі ў Зэльве, Слоніме і слынным Снове.

У праграме сустрэч, як заўсёды, прэзентацыя газеты, віктарына, вершы і байкі са скарбонкі народнага гумару, розыгрыш прызоў...

То прыходзьце!

**Валянціна ДОЎНАР, Таццяна ЛЯЎКОВІЧ, Уладзімір ЗДАНОВІЧ, Яўген ПЯСЕЦКІ.**

**P.S.** *Аб месцы і часе сустрэч — у заўтрашнім нумары.*

## «МІНСКАЯ ВОБЛАСЦЬ ПАВІННА ІМКНУЦЦА ВЫЙСЦІ НА ЛІДЗІРУЮЧЫЯ ПАЗІЦЫІ Ў КРАІНЕ»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прадставіў на пасадзе старшыні Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Леаніда Крупца. Кандыдатура Леаніда Крупца была аднагалосна зацверджана 11 чэрвеня на пазачарговай сесіі абласнога Савета дэпутатаў. Кіраўнік дзяржавы асабіста ўручыў губернатару Мінскай вобласці службовае пасведчанне.**

Як падкрэсліў Прэзідэнт, Леанід Крупец — «чалавек ад зямлі, сялянін». Ён узначальваў Нясвіжскі райвыканкам, які пад яго кіраўніцтвам быў адным з лепшых у рэспубліцы. Пяць гадоў працаваў першым намеснікам старшыні Мінскага аблвыканкама. У апошні час ён займаў пасаду памочніка Прэзідэнта — галоўнага інспектара па Віцебскай вобласці.

Аляксандр Лукашэнка выказаў перакананасць, што новы губернатар Мінскай вобласці, ведаючы праблемы рэгіёна і людзей, зможа адразу ж без раскачкі ўзяцца за іх вырашэнне. Як адзначыў Прэзідэнт, па сваіх прафесійных і асабістых якасцях, жыццёвым вопыту і напрацаванаму кіраўніцкаму кругагляду Леанід Крупец здольны забяспечыць гэты ўчастак работы.

Кіраўнік дзяржавы растлумачыў, што падставай для назначэння Леаніда Крупца на пасаду губернатара Мінскай вобласці паслужылі не эканамічны абвал або нейкія сацыяльныя канфлікты ў вобласці. Сёння, паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, новыя ўмовы гаспадарання патрабуюць кардынальнага павышэння эфектыўнасці кіраўнічай дзейнасці і адказнасці кіруючых кадраў, асабліва на рэгіянальным узроўні.

«Многае залежыць ад асобы старшыні аблвыканкама. Ён адказвае за ўсё ў вобласці — ад гаспадарчых спраў да палітычных. Гэта публічная фігура, па справах і ўчынках якой людзі мяркуюць аб здольнасці кіраваць сітуацыяй», — дадаў беларускі лідар.

Мікалай Дамашкевіч застанецца ў сістэме кіравання краінай, заявіў Прэзідэнт. Кіраўнік дзяржавы сказаў, што ў свой час Мікалай Дамашкевіч быў незаменны. Ён амаль дзевяць гадоў кіраваў вобласцю, адзначыў прэзідэнт. Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, сёння час патрабуе новых кіраўнікоў. Аляксандр Лукашэнка чакае змены стылю ў кіраванні Мінскай вобласцю. Гэты факт Прэзідэнт адзначыў асабліва. Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, пакуль эканамічны патэнцыял сталічнай вобласці рэалізаваны не ў поўнай меры.

Мінская вобласць — гэта сталічны рэгіён, і мясцовыя органы ўлады павінны імкнуцца па ўсіх паказчыках выйсці на лідзіруючыя пазіцыі ў краіне, заявіў Прэзідэнт. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што Мінская вобласць мае шэраг перавагаў перад іншымі рэгіёнамі. Гэта найбольш зручнае геаграфічнае становішча, добрыя землі, матэрыяльна-тэхнічная база і развітая інфраструктура (дарогі, транспарт, сувязь), мноства навуковых і навучальных устаноў, высокая забяспечанасць кадрамі.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, у 2006 годзе аграпрамысловым комплексам Мінскай вобласці не былі выкананы ў поўным аб'ёме заданні Дзяржаўнай праграмы адраджэння і развіцця вёскі. Так, з 269 кантрольных параметраў не забяспечана выкананне 39, з іх у вытворчай сферы — 38 параметраў. Не былі выкананы прагнозныя паказчыкі па валавому збору льнавалакна, рапсу, бульбы, збожжа, агародніны. Па ўраджайнасці збожжавых культур вобласць знаходзіцца на трэцім месцы, уступаючы Гродзенскай і Магілёўскай абласцям.

Мінская вобласць да 2011 года павінна будаваць больш як 1 млн 100 тыс.кв.м жылля ў год, паставіў задачу Аляксандр Лукашэнка. Як адзначыў кіраўнік дзяржавы, пры гэтым да 65 працэнтаў жылля неабходна ўзводзіць у сельскай мясцовасці і малых гарадах. «Будаўніцтва жылля з'яўляецца адным з прыярытэтных напрамкаў у развіцці нашай краіны. Мінская вобласць павінна нарошчваць тэмпы жыллёвага будаўніцтва і асаблівую ўвагу трэба ўдзяляць вырашэнню жыллёвых праблем грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, асабліва маладых і шматдзетных сем'яў», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Гэты год стане для Беларусі экзаменам, выпрабаваннем на трываласць сацыяльна-эканамічнай мадэлі развіцця краіны, лічыць кіраўнік дзяржавы. Прэзідэнт запатрабаваў нарошчваць экспарт беларускай прадукцыі для падтрымання стабільнасці на валютным рынку краіны.

«Пытанні экспарту, рэалізацыі на знешнім рынку нашай прадукцыі застаюцца вельмі значнай задачай. Пакуль увогуле ў краіне, і ў прыватнасці ў Мінскай вобласці, у гэтым напрамку сітуацыя застаецца даволі напружанай», — падкрэсліў беларускі лідар.

Паводле яго слоў, у Мінскай вобласці прагнознае заданне па тэмпу росту экспарту тавараў не выконвалася ў 2006 годзе, не выконваецца і ў гэтым. «Больш таго, у першым квартале гэтага года дапушчана скарачэнне экспарту тавараў. Але калі мы прадалі менш — значыць, не атрымалі валюту. Самая страшная для нас праблема — дэстабілізацыя фінансавага рынку. Памятаеце дэфолт 1998 года ў Расіі і як мы з яго цяжка выходзілі. Не дай Бог дапусціць гэта ў нашай краіне. А мы да гэтага, можна сказаць, ішлі ў канцы мінулага — у пачатку гэтага года, калі рэсурсы былі невялікія і калі Расія падкінула нам вядомыя праблемы. Вы гэтага не адчулі, а я гэта адчуў спаўна», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Ён таксама адзначыў, што ў Беларусі «літаральна за 4—5 месяцаў удалося аднавіць тое, што ў нас было да крызіснага перыяду». «Насельніцтва вярнула ўклады і размяшчае ў банках больш дэпазітаў, чым гэта было да крызісу», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што ў Беларусі «заўсёды будзе ў эканоміцы спакойна, калі мы будзем прадаваць больш, чым купляем». «Таму што калі мы будзем прадаваць менш тавараў, чым увозіць у краіну, то рана ці позна ў нас будзе абвал. А гэта страшная рэч», — сказаў Прэзідэнт.

У Беларусі будуць прыняты жорсткія меры па барацьбе з карупцыяй, заявіў Аляксандр Лукашэнка. «У гэтай барацьбе спакою з майго боку ніколі не будзе. Я цэлы год папярэджваў пасля выбараў: займіцеся гэтай справай і не дапускайце гэтых рэчаў».

***(Заканчэнне на 3-й стар.)***

## ПРЫВАБНЫЯ ПРАЦЭНТЫ

### З пачатку года істотна ўзрасла даходнасць па дэпазітах насельніцтва ў беларускіх банках

**Больш за палову ад прагназуемай ніжняй мяжы па прыросту дэпазітаў беларусаў на гэты год «пройдзена» ўкладчыкамі ўсяго за пяць месяцаў: людзі папоўнілі за гэты час банкаўскія дэпазіты ўжо на 881,1 мільярда рублёў. Нагадаем, што Асноўнымі напрамкамі грашова-крэдытнай палітыкі Беларусі на гэты год прадугледжваецца, што ўклады насельніцтва павялічацца на 1,7—2 трыльёны рублёў.**

Паводле апошніх даных, якія карэспандэнту «Звязды» прадаставіў прэс-сакратар Нацыянальнага банка Міхаіл Журавовіч, за студзень—май рублёвыя і дэпазіты ў замежнай валюце выраслі на 11,3 працэнта і склалі амаль 8,7 трыльёна рублёў. Прычым рублёвыя ўклады ўзраслі больш як на 363 мільярда рублёў, ці на 6,8 працэнта, а ў замежнай валюце — на 238,8 мільёна долараў ЗША (на 20,6 працэнта).

Між іншым, каментуючы істотны прырост дэпазітаў у СКВ, спецыялісты гавораць пра тое, што на сітуацыю паўплывалі ўжо мінулыя падзеі, калі наша краіна вымушана была рэгуляваць пытанні па пастаўцы энерганосьбітаў у рэспубліку, па цэнах на іх, а таксама людзі былі дэзарыентаваны і чуткамі аб магчымай дэнамінацыі беларускага рубля: як памятаеце, на пачатку года, у студзені, назіраўся і ажыятажны попыт на цвёрдаканвертаваную. Тым не менш на пачатак чэрвеня дэпазіты грамадзян у нацыянальнай валюце склалі каля 5,7 трыльёна рублёў, а ў замежнай — амаль 1,4 мільярда долараў ЗША.

Як бачна, укладам у рублях насельніцтва ўсё ж такі па-ранейшаму аддае перавагу. Аднак тут няма якраз нічога дзіўнага: паводле слоў Міхаіла Журавовіча, галоўны банк праводзіў і ў далейшым мае намер прытрымлівацца працэнтнай палітыкі, якая накіравана на забеспячэнне больш прывабных умоў па зберажэннях менавіта ў беларускіх рублях. Што ён, дарэчы, пацвердзіў і канкрэтнымі лічбамі. Паводле даных прэс-сакратара, па новых тэрміновых рублёвых дэпазітах насельніцтва даходнасць пастаянна расце. У красавіку яна дасягнула 13,4 працэнта гадавых, што на 1 працэнтны пункт вышэй, чым у папярэднім месяцы, і на 2,5 працэнтнага пункта ў параўнанні са снежнем мінулага года. А вось рублёвая даходнасць доларавых дэпазітаў фізічных асобаў у красавіку склала 8,3 працэнта гадавых, што ў 1,6 раза ніжэй даходнасці тэрміновых дэпазітаў у беларускіх рублях. Якія працэнты па ўкладах далей будуць прапаноўваць банкі, гэта ў многім залежыць ад стаўкі рэфінансавання. Прынамсі, паводле папярэдняй інфармацыі, у гэтым месяцы Нацыянальны банк яе зніжаць не плануе.

Пра тое, што сёння выгадней за ўсё захоўваць грошы ва ўкладах у нацыянальнай валюце, гаворыць і **эксперт «Звязды», дэкан эканамічнага факультэта БДУ, прафесар Міхаіл КАВАЛЁЎ.** Паводле яго слоў, стаўка рэфінансавання па-ранейшаму застаецца высокай: Нацыянальны банк падняў яе, нагадаў прафесар, таму што ў пачатку года існавала пагроза адтоку ўкладаў.

**— Мяркую, што ў бліжэйшы час Нацыянальны банк крыху знізіць стаўку рэфінансавання, — прагназуе Міхаіл Кавалёў. — Аднак нават пры зніжанай стаўцы, як і раней, будзе выгадна захоўваць зберажэнні ў банках у беларускіх рублях. На другое месца я б на гэты год паставіў уклады ў расійскіх рублях: расійскі рубель у адносінах да долара мацнее, а працэнты па такіх дэпазітах дастаткова высокія. Калі яшчэ засталіся грошы, то можна падзяліць іх папалам — паміж еўра і доларам.**

**У тым жа выпадку, калі ў кагосьці шмат долараў, то лепш за ўсё памяняць іх на беларускія і расійскія рублі і пакласці на дэпазіт у банк, — раіць эксперт «Звязды».**

**Ігар ШЧУЧЭНКА.**

## Прэзідэнт Беларусі павіншаваў

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Уладзіміра Пуціна з Днём Расіі.

«Упэўнены, што нашы краіны, паслядоўна выконваючы ўзятыя на сябе абавязацельствы па паглыбленню ўзаемавыгаднай інтэграцыі, будуць рухацца наперад па шляху саюзнага будаўніцтва, умацоўваць упэўненасць беларусаў і расіян у поспеху пачатай справы», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь**

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 9 чэрвеня павіншаваў Каралеву Злучанага Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі Лізавету ІІ з нацыянальным святам — Днём нараджэння Каралевы. Аб гэтым **БЕЛТА** паведамілі ў прэс-службе кіраўніка беларускай дзяржавы.

## «НЕ ЗЛУЙСЯ!»



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**На скрыжаванні вуліц Леніна і Ульянаўскай (Ленінскі раён беларускай сталіцы) з'явіліся гэтыя дарожныя знакі, якіх няма ні ў новых, ні ў старых Правілах дарожнага руху. У бліжэйшым нумары «Звязды» — каментарый спецыялістаў ДАІ.**

ISSN 1990 - 763X

07107>

9771990763008

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ЗША ГАТОВЫ АТАКАВАЦЬ ІРАН І ЎЗЯЦЬ ЯГО Ў НАФТАВУЮ БЛАКАДУ

**У ЗША гатовы план ваеннай аперацыі супраць Ірана, якая ўключае атаку з паветра і нафтавую блакаду Ісламскай рэспублікі. Галоўную ролю павінен адыграць ваенна-марскі флот. Тым часам Іран пагражае пагрузіць у хаос вайны ўвесь Блізкі Усход у выпадку, калі Амерыка атакуе яго ядзерныя аб'екты.**

Газета The Jerusalem Post са спасылкай на высокапастаўленых афіцэраў арміі ЗША паведаміла, што, па амерыканскіх разліках, у Ірана будзе ядзерная бомба ў бліжэйшыя тры гады, і ў Пентагоне падтрымліваюць імкненне прэзідэнта Буша зрабіць усё магчымае, каб спыніць іранскую ядзерную праграму. Крыніца газеты перакanana, што жорсткія «дадатковыя крокі» для гэтага будуць неабходныя.

JP расказала і пра схему нафтавай блакады Ірана. Каб у краіны не было магчымасці атакаваць амерыканскія судны, у тэрытарыяльныя воды яны заходзіць не будуць. Пры гэтым на далёкіх подступах караблі ЗША будуць «заварочваць» усе нафтавыя танкеры, якія накіроўваюцца ў парты Ірана на загрузку нафтай. Нафта — асноўная крыніца экспарту Ісламскай рэспублікі, і такая блакада будзе вельмі жорсткай.

Іранскія пагрозы адрасаваны ў першую чаргу краінам Персідскага заліва якія супрацоўнічаюць з амерыканскімі ваеннымі, — Катару, Бахрэйну, Аману, Саудаўскай Аравіі, ААЭ і Кувейту. Іранскі адмірал Алі Шамхані заявіў, што ў выпадку нападу Іран у адказ атакуе не толькі амерыканскія ваенныя базы, але і такія стратэгічныя цэлі, як электрастанцыі і заводы па перапрацоўцы нафты. Іранскі адмірал пры гэтым падкрэслівае, што відавочнай мэтай іранскай контратакі стане і Ізраіль. Ён сцвярджае, што ракетныя войскі Ірана ў стане «знішчыць амерыканскія сістэмы процірaкетнай абароны».

### САВЕЦКІХ ВОІНАЎ З ТЫНІСМЯГІ ПЕРАЗАХАВАЮЦЬ З ЛІПЕНЯ

Камісія пры міністэрстве абароны Эстоніі, якая займаецца пераносам рэштак савецкіх салдатаў з талінскага ўзгорка Тынісмягі, прызначыла перазахаванне на 3 ліпеня 2007 года. Эстонскі бок абяцае пакрыць выдаткі родных загінулых, звязаныя з прыездам на пахаванне.

### ШАТЛАНДЫЮ ПРЫЗНАЛІ ГОРШАЙ З МАЛЫХ КРАІН ЗАХОДНЯЙ ЕЎРОПЫ

**Шатландыя развіваецца горш за іншыя малыя краіны ў Заходняй Еўропе. Пра гэта паведамляецца ў справаздачы Федэрацыі малога бізнэсу Вялікабрытаніі.**

У індэкс Федэрацыі ўключаны краіны Заходняй Еўропы з насельніцтвам менш за дзевяць мільёнаў чалавек, у прыватнасці, Нарвегія, Ісландыя і Ірландыя. Высновы робяцца на параўнанні эканамічнага развіцця, узроўню занятасці насельніцтва, аховы здароўя і адукацыі ў гэтых краінах. Мацней за ўсё на месца Шатландыі паўплывала вельмі нізкая працягласць жыцця насельніцтва.

### ШПАГА НАПАЛЕОНА ПАЙШЛА З МАЛАТКА ЗА 6 МЛН ДОЛАРАЎ

**Інкруставаная золатам шпага, якая належала імператару Напалеону, у нядзелю была прададзена на аўкцыёне ў Францыі за шэсць мільёнаў 400 тысяч долараў.**

Як паведамляецца, гэту шпагу Банапарт насіў яшчэ будучы генералам падчас знакамітай бітвы пры Марэнга супраць аўстрыйскай арміі ў 1800 годзе. Пасля перамогі будучы імператар падарыў яе свайму брату на вяселле. З таго часу шпагу перадавалі ў спадчыну. Яна была апошняй шпагай знакамітага палкаводца, якая знаходзілася ў прыватнай калекцыі. У 1978 годзе шпагу абвясцілі нацыянальным багаццем Францыі.

**УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»**

проводит повторный открытый аукцион

***по продаже обращенного в доход государства производственного корпуса № 7 ОАО «Минский приборостроительный завод» (литер Г 3/К) общей площадью 5978 кв.м, расположенного по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 58. Начальная цена — 7 373 115 750 белорусских рублей.***

Задаток в размере 5% от начальной цены перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «Белпромстройбанк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, г. Минск, бульвар им. В. Мулявина, 6, УНП 190398583, ОКПО 37533851. Оплата объекта осуществляется в течение 2 месяцев и 25 календарных дней с даты проведения аукциона. Отвод земельного участка будет осуществляться Минской городской землеустроительной и геодезической службой в установленном порядке. Порядок проведения торгов оговорен в условиях проведения аукциона. Аукцион состоится 6 июля 2007 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 5 июля 2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6.

**ТЕЛЕФОН ДЛЯ СПРАВОК (017)227-48-36.**

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО

БЕЛВНЕШЭКОНОМБАНК

**Открытое акционерное общество «Белвнешэкономбанк», расположенное по адресу: 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32, сообщает о проведении 20 июня 2007 г. Общего собрания акционеров в заочной форме.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ**

1. *О продаже Банку внешнеэкономической деятельности СССР (Внешэкономбанк, г. Москва) поступивших в распоряжение ОАО «Белвнешэкономбанк» акций собственного выпуска.*
2. *О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи управлению физической культуры, спорта и туризма Гомельского областного исполнительного комитета.*
3. *О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи Общественному объединению «Белорусская ассоциация помощи детям-инвалидам и молодым инвалидам».*
4. *О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи Государственному учреждению «Дворец Республики».*
5. *О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи Общественному объединению «Белорусский республиканский союз молодежи».*
6. *О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи Кузьмич И.В.*
7. *О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи Кунец С.И.*
8. *О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи Республиканскому Совету Белорусского общественного объединения ветеранов.*

Список лиц, имеющих право на участие в Общем собрании акционеров, составлен на основании данных реестра владельцев акций ОАО «Белвнешэкономбанк», сформированного на 1 июня 2007 года.

Лица, имеющие право на участие в Общем собрании акционеров, могут ознакомиться с решением о проведении Общего собрания акционеров ОАО «Белвнешэкономбанк» в заочной форме, другой необходимой информацией и заполнить бюллетени для заочного голосования ежедневно, кроме выходных и праздничных дней, с 9.00 до 13.00 в течение семи дней со дня опубликования данного сообщения включительно по адресу: г. Минск, ул. Скрыганова, 6, ком. 707, а также в филиалах ОАО «Белвнешэкономбанк».

Заполненные бюллетени для заочного голосования должны быть представлены в ОАО «Белвнешэкономбанк» не позднее 18 июня 2007 г. по адресу: Республика Беларусь, 220073, г. Минск, ул. Скрыганова, 6, ком. 707, почтой, нарочным либо по факсу (8-017) 209-25-48 с обязательной доставкой (досылкой) оригинала бюллетеня.

**ДОПОЛНИТЕЛЬНАЯ ИНФОРМАЦИЯ ПО ТЕЛЕФОНАМ: (8-017) 209-24-21, 209-25-40.**

# У Беларусі да 2010 года плануецца накіраваць каля Br2 трлн на развіццё 187 населеных пунктаў

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка зацвердзіў Дзяржаўную комплексную праграму развіцця рэгіёнаў, малых і сярэдніх гарадскіх паселішчаў на 2007—2010 гады. Адпаведны Указ кіраўнік дзяржавы падпісаў 7 чэрвеня.**

Дзяржпраграма, якая ахоплівае 187 населеных пунктаў, накіравана перш за ўсё на рэалізацыю інвестыцыйных праектаў (каля 1000, у тым ліку 195 найважнейшых), стварэнне новых рабочых месцаў (больш як 19 тыс.), зніжэнне ўзроўню беспрацоўя (да 1 працэнта), павышэнне якасці жыцця людзей.

У гэтых мэтах будзе аказвацца дзяржаўная падтрымка суб'ектам гаспадарання, павышацца іх канкурэнтаздольнасць, ствараюцца ўмовы для развіцця малога бізнэсу ў сферы вытворчасці тавараў і паслуг. На рэалізацыю дзяржпраграмы плануецца накіраваць каля Br2 трлн, з якіх чвэрць — бюджэтныя сродкі. Адначасова кіраўнік дзяржавы падпісаў Указ № 266, якім аблвыканкамы надзелены больш шырокімі паўнамоцтвамі па прадастаўленню суб'ектам гаспадарання ўсіх формаў уласнасці прэферэнцый, у тым ліку гарантый па банкаўскіх крэдытах за кошт мясцовых бюджэтаў. Такім чынам, на заканадаўчым узроўні створана цэласная сістэма, якая дае магчымасць рэалізаваць у бліжэйшыя гады адзін з прыярытэтаў сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі.

Урадам сумесна з органамі мясцовай улады будуць распрацаваны і рэалізаваны ў гэтай пяцігодцы канкрэтныя мерапрыемствы па выкананню заданняў Дзяржаўнай комплекснай праграмы развіцця рэгіёнаў, малых і сярэдніх гарадскіх паселішчаў на 2007—2010 гады.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# Слуцк можа стаць «салаўінай сталіцай» Беларусі

**Слуцк прэтэндуе на званне «Горад салаўя» ў Беларусі. Падчас праведзенага нядаўна падліку высветлілася, што ў раённым цэнтры гняздуецца 516 птушыных спевакоў. Гэта складае ў сярэднім па аднаму салаўю на кожныя 6 га зямлі і лічыцца вельмі добрым паказчыкам.**

Як расказала кіраўнік гуртка «Юны арнітолаг» Слуцкага эколага-біялагічнага цэнтра навучэнцаў Галіна Мілянцей, акцыя па падліку салаўёў, якія пражываюць у Беларусі, арганізавана рэспубліканскай грамадскай арганізацыяй «Ахова птушак Бацькаўшчыны». Паводле яе ўмоў, статус «Горад салаўя» атрымае населены пункт, дзе будзе зарэгістравана найбольшая колькасць крылатых спевакоў.

Галіна Мілянцей адзначыла, што нароўні са спецыялістамі Слуцкага эколага-біялагічнага цэнтра навучэнцаў, на базе якога працуе рэгіянальнае аддзяленне ГА «Ахова птушак Бацькаўшчыны», у акцыі па падліку салаўёў прынялі ўдзел практычна ўсе школы горада, дарослае насельніцтва Слуцка. «Мы не чакалі ад гараджан такой актыўнасці, такіх ведаў зацішных салаўіных куточкаў», — сказала спецыяліст.

Паводле яе слоў, пасля рэгістрацыі месцаў знаходжання птушак, адсеву даных, якія паўтараюцца, і складання карты стала відавочным, што птушка года абжыла фактычна ўсю тэрыторыю Слуцка. Асабліва актыўна салаўі гняздуюцца ўздоўж галоўнай воднай артэрыі горада — ракі Случ. «Знакамітыя салаўіныя трэлі можна пачуць практычна на цэнтральнай плошчы Слуцка. А ў цэлым у горадзе склаліся сапраўды спрыяльныя ўмовы для пражывання гэтых птушак: шмат нізінных мясцін з высокай вільготнасцю, кустовых зялёных насаджэнняў», — патлумачыла Галіна Мілянцей.

Яна таксама дадала, што ў горадзе пражывае шмат рэдкіх відаў птушак, у тым ліку і «чырванакнізхнікаў». Нядаўна выяўлены гнёзды вяртлявай чаротаўкі. «Што да статуса «салаўінай сталіцы» Беларусі, то мы ўпэўненыя, што ў Слуцка ёсць усе шанцы атрымаць яго», — лічыць спецыяліст. Да слова, рашэнне па гэтаму пытанню павінна быць абнародавана рэспубліканскай грамадскай арганізацыяй «Ахова птушак Бацькаўшчыны» да канца чэрвеня. Нагадаем, што салодкагалосы салавей аб'яўлены ў краіне птушкай 2007 года.

**Таццяна ШАБЛЫКА, БЕЛТА.**

Абітурыент-2007

# КАЛЬКУЛЯТАР НА МАТЭМАТЫЦЫ — ПЕРСОНА НОН-ГРАТА

**12 чэрвеня ў Беларусі стартуе цэнтралізаванае тэсціраванне. Сёлета ўдзельнічаць у ім будзе рэкордная колькасць чалавек. Калі ў 2006 годзе пунктамі рэгістрацыі было выдадзена 473 тысячы пропускаў, то сёлета — амаль 559 тысяч. Самай запатрабаванай сярод абітурыентаў гэтага года аказалася матэматыка — на яе зарэгістраваліся 127 тысяч чалавек. Напярэдадні адказнага старту «Звязда» адказвае на пытанні, якія хвалююць удзельнікаў экзаменацыйных выпрабаванняў.**

***— Што трэба мець з сабой удзельніку цэнтралізаванага тэсціравання?***

— Абавязкова неабходна мець пры сабе зарэгістраваны пропуск, дакумент які пацвердзіць асобу (пашпарт, пасведчанне на права жыхарства, пасведчанне бежанца) і гелевую або капілярную ручку з чарніламі чорнага колеру (чорныя чарнілы добра «чытаюцца» камп'ютарам).

***— Што рабіць, калі пашпарт у абітурыента нядаўна выкралі?***

— У гэтым выпадку трэба як мага хутчэй звярнуцца ў органы ўнутраных спраў, якія выдадуць узамен страчанага пашпарт даведку № 9.

***— Якім калькулятарам можна карыстацца на цэнтралізаваным тэсціраванні?***

— Калькулятарам дазваляецца карыстацца толькі на тэсціраванні па фізіцы і хіміі, і калькулятар павінен быць з самымі простымі вылічальнымі функцыямі. Просты калькулятар выконвае чатыры арыфметычныя дзеянні, мае адзін рэгістр памяці, а з дадатковых функцый вылічвае працэнты і квадратныя карані. Арганізатары забараняюць выкарыстоўваць інжынерныя, графічныя калькулятары, а таксама ўсе калькулятары, убудаваныя ў іншыя прыборы, напрыклад, у электронныя запісныя кніжкі, мабільныя тэлефоны і г.д. Калі заўважаць у вас такое прыстасаванне, вы аўтаматычна пазбавіцеся магчымасці здаваць тэсціраванне. Абітурыенту забараняецца таксама праносіць у аўдыторыі, дзе праходзіць тэсціраванне, мабільныя тэлефоны, кнігі, сшыткі, запісы, сумкі, пэйджары і іншыя сродкі захоўвання, прыёму і перадачы інфармацыі, мяняцца ў аўдыторыі месцамі, выкарыстоўваць чужую дапамогу пры выкананні тэставых заданняў.

***— Як налічваюцца балы за правільныя адказы?***

— Балы за кожнае заданне налічваюцца зыходзячы з таго, колькі ўдзельнікаў тэсціравання змаглі з ім справіцца. Камп'ютарная праграма вызначае так званы каэфіцыент складанасці. За выкананне больш складанага задання ўдзельніку тэсціравання налічваецца адпаведна больш высокі бал.

У тэставых заданнях па беларускай (рускай) мове дапускаюцца некалькі правільных адказаў (ад аднаго да пяці). Часткова правільныя адказы таксама ўлічваюцца, і за іх абітурыент атрымлівае пэўную колькасць балаў. Часткова правільным лічыцца адказ, у якім дапушчана не больш за адну памылку. Прычым памылкай можа быць як указанне няправільнага варыянту, так і не ўказанне правільнага адказу. У дакладных навуках можа быць толькі адзін правільны адказ. Па гісторыі Беларусі і дысцыпліне «Чалавек. Грамадства. Дзяржава» часткова правільныя адказы не ўлічваюцца.

***— Які мінімальны бал трэба набраць на ЦТ, каб ён даваў права на паступленне?***

У адпаведнасці з Пастановай Міністэрства адукацыі ад 28 лютага 2007 года №16, адзнака прызнаецца нездавальняючай для ўсіх прадметаў ад 1 да 14 тэставых балаў уключна. Мінімальны тэставы бал, які дазваляе ўдзельнічаць у конкурсе, — 15.

***— Калі абітурыент прапусціў ЦТ ў асноўны дзень, які дакумент дасць права здаць гэту дысцыпліну ў рэзервовы дзень? І ці запусцяць у аўдыторыю абітурыента, які спазніўся?***

Трэба мець на руках пропуск на прапушчанае ЦТ і дакумент, які зможа пацвердзіць уважлівую прычыну няяўкі: хваробу ці іншыя форс-мажорныя абставіны, якія не дазволілі ўдзельнічаць у ЦТ.

Усе тэсты будуць пачынацца ў 11 гадзін раніцы, і арганізатары рэкамендуюць з'яўляцца на месца правядзення тэсціравання як мінімум за паўгадзіны. Калі вы з'явіцеся пасля адкрыцця пакета з педагагічнымі тэстамі, то рызыкуеце не прайсці цэнтралізаванае тэсціраванне. Трэба мець на ўвазе, што не заўсёды пункты рэгістрацыі супадаюць з месцам правядзення тэсціравання, таму абітурыентам неабходна ўважліва прачытаць на сваім пропуску адрас і месца правядзення ЦТ.

***— У якіх выпадках абітурыент можа пакінуць аўдыторыю?***

Абітурыент мае права пайсці ў любы момант. У выпадку, напрыклад, калі абітурыенту экстранна спатрэбіцца выйсці ў прыбіральню, ён можа здаць экзаменацыйную работу арганізатарам, затым у суправаджэнні супрацоўніка цэнтра тэсціравання пакінуць аўдыторыю, вярнуцца і прадоўжыць выпрабаванне.

***— Ці можа абітурыент абскардзіць вынікі цэнтралізаванага тэсціравання?***

Працэдура апеляцыі на цэнтралізаваным тэсціраванні не прадугледжана. Дакладней, яна не такая, як на традыцыйным экзамене. Абітурыент мае права ў працэсе тэсціравання заявіць, што нейкае заданне, па яго меркаванню, складзена некарэктна, у ім утрымліваецца памылка ці не прыведзена правільных адказаў. Аб гэтым ён павінен паведаміць адказнаму арганізатару ў аўдыторыі. Усе прэтэнзіі заносяцца ў спецыяльны пратакол. Кожная заўвага затым правяраецца, і калі раптам пацвердзіцца яе справядлівасць, то ўсім удзельнікам тэсціравання гэта заданне будзе залічана як правільна выкананае. А вось падаць апеляцыю постфактум нельга, інакш для ўсіх незадаволеных вынікамі тэставых выпрабаванняў давялося б праводзіць яшчэ адно тэсціраванне. Пры выяўленні тэхнічных дэфектаў у бланках адказаў ці апячатак у тэставых заданнях, якія ўплываюць на правільнасць адказаў тэсціруемых, усім удзельнікам ЦТ адказ па дадзенаму тэставаму заданню залічваецца як правільны.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**«ГАРАЧЫЯ» ТЭЛЕФОННЫЯ ЛІНІІ ДЛЯ АБІТУРЫЕНТАЎ**
**Штаб Дзяржаўнай камісіі па кантролю за ўступнымі іспытамі ў Мінску (8-017) 227-66-80.**
**Брэсцкая абласная камісія (8-0162) 23-16-90.**
**Гомельская абласная камісія (8-0232) 70-16-46, 70-18-00.**
**Віцебская абласная камісія (8-0212) 33-37-90, 36-28-78.**
**Гродзенская абласная камісія (8-0152) 74-52-72, 72-22-25.**
**Мінская абласная камісія (8-017) 284-06-96.**
**Магілёўская абласная камісія (8-0222) 31-07-75, 22-18-97.**
***«Гарачая» лінія ў Міністэрстве адукацыі Рэспублікі Беларусь (8-017) 200-84-70.***

Край раскрытых душ і дзвярэй



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# АКУНУЦЦА Ў СВЕТ БЕЛАРУСКАЙ ВЁСКІ

**Не ў кожнага з нас ёсць магчымасць паехаць у час водпуску за мяжу і тады варта падумаць аб так званым унутраным турызме, па Беларусі. У рамках прэс-тура, які арганізавалі Міністэрства спорту і турызму і Нацыянальнае агенцтва па турызму, карэспандэнту «Звязды» ўдалося параўнаць некалькі відаў адпачынку (пазнавальны, рэкрэацыйны і сельскі турызм) і пазнаёміцца з інфраструктурай Мядзельскага раёна Мінскай вобласці, Пастаўскага і Расонскага раёнаў Віцебшчыны. А свой расказ я пачну з, пэўна, самага перспектыўнага для нашай краіны віду турызму — гэта аграэкатурызм, ці сельскі турызм.**

Ён падыходзіць жыхарам вялікіх гарадоў, асабліва сталіцы, каму надакучылі шум матораў, дарожны пыл, забруджанае паветра і інтэнсіўны рух жыцця. Адпачыць у аграсядзібе жадаюць аматары нацыянальнай кухні, сельскага быту і беларускіх традыцый. Прыязджаюць нават... уладальнікі дачных участкаў, бо і ім хочацца іншы раз пагнуць спіну, адарвацца ад сваіх градак і спакойна правесці час на прыродзе. Гаспадар аграсядзібы і накорміць, і напоіць, і прадаставіць у распараджэнне ўсё неабходнае — лодку, лазню і г. д. Наўрад ці ўтульна адчуюць сябе ў сельскай сядзібе дамы, якія не жадаюць развітвацца з туфлямі на абцасах, аматары свецкіх тусовак і клубных вечарынак. Аднак, каб пераканацца ў тым, што гэта вам не падыходзіць ці, наадварот, стаць пастаяннымі гасцямі ў сельскіх сядзібах, лепей хоць раз трапіць у адну з іх.

Як выбраць сельскую сядзібу? Вызначце месца яе знаходжання. Калі не хочаце ехаць, куды Макар цялят не ганяў, шукайце хатку бліжэй да дому. Абавязкова даведайцеся, колькі «пеўнікаў» мае сядзіба. Гэта — як колькасць зорак у гатэлі — дапаможа даведацца аб камфортнасці ўмоў пражывання і прадастаўлення паслуг. Максімальна можа быць чатыры «пеўнікі», што сведчыць аб самым высокім узроўні сэрвісу. Мне ўдалося пабываць у адной з такіх камфартабельных сядзіб у Міёрскім раёне (у стылізаваную пад даўніну драўляную хату, з печчу, дубовым ложкам, самаварам на стале, я ўваходзіла як гераіня тэлепраграмы «Кватэрнае пытанне»: настолькі ўразіў мяне інтэр'ер). Удакладніце таксама, якую праграму вам могуць прапанаваць, канешне, калі ў вас няма сваіх планаў. Напрыклад, у «Кролавай хаце» (3 пеўнікі) у вёсцы Забор'е Расонскага раёна можна карыстацца лазняй, адправіцца на экскурсію да Рагнедзінага кургана, дзе, паводле падання, пахаваны полацкі князь Рагвалод і яго дачка Рагнеда, да роднай вёскі беларускага літаратара Яна Баршчэўскага — Мурагі, гарадзішча ранняга жалезнага веку, у музей П.М. Машэрава. Часцей за ўсё няглядзячы на аддаленасць ад беларускай і расійскай сталіц, у хату **Аляксандра Крола** прыязджаюць мінчане і маскоўцы. «Адна справа ездзіць на курорт, а зусім іншая — жыць на курорце, — так характарызуе сваю сядзібу гаспадар. — Адпачываць у нас любяць сем'і з дзецьмі. Яны праводзяць летам тут тыдні два». З-за вялікай колькасці хатніх спраў у гаспадыні часу размаўляць з карэспандэнтамі не знайшлося, затое мы з задавальненнем пакаштавалі яе журавінавы квас, салату з капусты, бліны з мёдам.

Вёска Забор'е, дарэчы, стала своеасаблівым цэнтрам сельскага турызму і не толькі беларускага. Трэці год запар тут праводзіцца «Заборскі фэст», міжнародны фестываль аграэкатурызму. Сёлета ён сабраў каля 300 спецыялістаў з Беларусі, Украіны, Расіі, ЗША, Германіі і г.д. Сярод экспертаў быў і **Тод Комен са штата Вермонт (ЗША), дырэктар інстытута інтэграванага сельскага турызму.** Два гады таму ён дапамагаў распрацоўваць мясцовы турыстычны маршрут «Блакітныя каралі Расонаў». У час сёлетняга наведвання Беларусі ён адзначыў станоўчыя змяненні, якія адбыліся ў сферы сельскага турызму — да ідэі агратурызму падключаецца ўсё большая колькасць людзей, мясцовая ўлада зацікаўлена ў развіцці сельскага турызму ў сваім рэгіёне. Паводле меркавання Тода Комена, уладальнікі сельскіх сядзіб сталі надаваць больш увагі стварэнню камфартабельных бытавых умоў для сваіх наведвальнікаў.

— У Беларусі вялікі патэнцыял — прыгожыя азёры і лясы, свой асаблівы каларыт. Вашы Расоны, як наш Вермонт, куды прыязджаюць адпачыць з мегаполісаў, напрыклад, з Нью-Йорка, — тлумачыць амерыканец. — Нашы фермеры з ахвотай падхопліваюць ідэю сельскага турызму, бо гэта прыносіць карысць і ім, і іх пастальцам. Сельскі турызм — паспяховая сфера эканамічнай дзейнасці для рэгіёнаў са слаба развітай прамысловасцю.

На пытанне, чым жа адрозніваецца беларускі і амерыканскі сельскі турызм, Тод Комен заўважыў, што яго землякам варта пераняць вялікую гасціннасць і цеплыню душы, якія характэрныя для жыхароў беларускай сельскай мясцовасці. Нездарма слоганам беларускага сельскага турызму прадстаўнікі ГА «Агра- і экатурызм», з лёгкай рукі «Звязды», выбралі выраз Уладзіміра Караткевіча — «Гэта край раскрытых душ і дзвярэй». З гэтымі словамі пагадзіўся б і аўтар праекта «Еўравікінгі», аматар экспедыцый **Бурхарт Піске з Германіі,** з якім я таксама пазнаёмілася на «Заборскім фэсце». Ён працуе ў турбізнесе, але адпачываць любіць не на курортах, а «дзікунам», каб быць бліжэй да прыроды. «Мы плывём на лодцы вікінгаў (яна без матора) па Дзвіне і атрымліваем вялікую асалоду ад некранутай беларускай прыроды, — дзеліцца сваімі ўражаннямі Бурхарт. — Сёлета ў нас паездка-тэст. Калі ўсё будзе нармальна, у наступным годзе я збяру большую інтэрнацыянальную групу, каб пазнаёміць яе з вашай краінай».

У рамках фестывалю «Заборскі фэст» прайшоў семінар, дзе эксперты абмяркоўвалі праблемы развіцця сельскага турызму ў СНД і ў Беларусі ў прыватнасці. **Дырэктар дэпартамента па турызму Міністэрства спорту і турызму Віктар Янкавенка** адзначыў, што развіццю аграэкатурызму ў нашай краіне спрыяе дзяржаўная падтрымка:

— З дня прыняцця Указа «Аб мерах па развіцці аграэкатурызму ў Рэспубліцы Беларусь» прайшоў амаль год. У выніку толькі за другое паўгоддзе 2006 года былі зарэгістраваны 34 сельскія сядзібы. За гэты перыяд яны прынялі тысячы беларускіх і замежных турыстаў.

Сельскія сядзібы ў нашай рэспубліцы карыстаюцца льготамі. Грамадзяне, якія пастаянна пражываюць у сельскай мясцовасці і маюць магчымасць займацца сельскім турызмам па заявачнаму прынцыпу, а ў год патрэбна выплачваць збор у памеры адной базавай велічыні. Прыбытак жа не абкладваецца падаткамі і іншымі плацяжамі. Аднак у сферы аграэкатурызму не ўсё так гладка:

— Каб займацца сельскім турызмам, трэба мець стартавы капітал, а атрымаць банкаўскі крэдыт праблематычна, бо крэдыты пад нізкія працэнты нашы банкі ўладальнікам сядзіб не выдаюць, — кажа Віктар Янкавенка. — Сярод актуальных тэм — расшырэнне геаграфіі адміністрацыйных тэрыторый, якія закранаюць аграэкатурызм. Справа ў тым, што сярод жадаючых займацца сельскім турызмам — грамадзяне, якія пражываюць у пасёлках гарадскога тыпу і ў раённых цэнтрах. Урэгуляванне патрабуе і супрацоўніцтва турфірм з сельскімі сядзібамі.

Паводле слоў **Валерыі Кліцуновай, старшыні праўлення ГА «Агра- і экатурызм»,** на сёння ў Беларусі больш як 100 сельскіх сядзіб. Большая іх колькасць знаходзіцца ў Мінскай, Брэсцкай і Гродзенскай абласцях. У развіцці сельскага турызму ўжо актывізавалася Магілёўшчына, а вось Гомельшчына пакуль адстае. На думку Валерыі Анатольеўны, акунацца ў свет беларускай вёскі павінны не толькі замежныя госці, для якіх гэта экзотыка, але і самі беларусы, бо нельга забываць на свае карані.

**Ірына ПРЫМАК.**
*Расонскі раён.*

**Неяк мая суседка расказала аб сваім браце, які працуе ў Капыльскай дапаможнай школе-інтэрнаце, маўляў, ён на канікулы забірае дваіх дзяцей-сірот. І дадала: «У іх гэта лічыцца нормай, дзетак забіраюць і іншыя супрацоўнікі.» Прызнаюся, мяне гэта ўразіла: не часта сёння і здаровых дзяцей з інтэрнатных устаноў забіраюць людзі, а тут размова ішла пра дзетак з інтэлектуальнай недастатковасцю.**

**— Забіраюць не толькі выхавальнікі, — смяецца з мяне дырэктар інтэрната Генадзь Ярмак, — але і настаўнікі, і работнікі сталовай, і нават нянечкі!**

**Калі я прыехала туды, то ўбачыла, што гэта звычайны інтэрнат, якіх я бачыла нямала, вось толькі людзі ў ім працуюць незвычайныя.**



*Аляксандр СМЫК і браты Андрэй і Сяргей МІНКЕВІЧЫ ідуць паіць цялят.*

# ДОМ ЧУЛЫХ СЭРЦАЎ

Людміла Пятрова, намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце, таксама забірае дзяцей. Яна паказвала мне спальні, дзе жывуць яе падапечныя. У адной са спальняў шмат вазонаў з кветкамі.

— Тут жыве хлопчык, які часта бывае ў маім доме, — з гонарам гаворыць Людміла Вячаславаўна. — Знойдзе дзе-небудзь галінку і пачынае яе расціць. Ён і мне шмат такіх вось вазонаў падарыў.

Яна стала расказваць, як яе сыны ходзяць з хлопцамі, якіх яна бярэ да сябе на выхадныя, на рыбалку, як збіраюць разам мёд, як увогуле ім весела.

— Разумееце, і я, і мае сыны, хочам трошкі парадаваць іх, можа, яны гэтыя дні будуць памятаць усё жыццё... — хаваючы слёзы, прамовіла Людміла Вячаславаўна. — Яны так пакрыўджаны лёсам.

Жанчына стараецца абагрэць як мага больш дзетак і таму забірае да сябе сірот пачаргова. Некаторыя забіраюць адно і тое ж дзіця ўвесь час...

— Юрася перавялі ў нашу ўстанову з іншага інтэрната, — расказвае Раіса Шпакоўская, класны кіраўнік сёмага класа. —- Я глядзела на яго і спачатку не разумела, што са мной адбываецца. Ведаеце, як бывае, калі сэрца шчыміць?

Жанчына стала запрашаць у сваю сям'ю хлопца. Хутка яны так да яго прывыклі, што Юрась стаў ім як родны. Хлопчык даволі складаны: час ад часу ў яго ўзнікаюць канфлікты з выхавальнікамі.

Адны асуджалі Раісу Паўлаўну за яе празмерную апеку, іншыя захапляліся яе цярпеннем. Госці, якія прыходзяць да Шпакоўскіх, сталі прыносіць хлопцу пачастункі. На сямейным савеце было вырашана па меры магчымасці дапамагаць хлопцу ў жыцці. Кажуць, усе добрыя намеры павінны вытрымаць іспыт. Так здарылася і тут. Аднойчы на склепе Шпакоўскіх зламаўся замок. Юра гэта ведаў і... употайкі ўзяў адтуль слоік з варэннем. Больш за тое, добрая душа, ён расказаў і іншым дзецям, і тыя таксама сталі ціхенька падмацоўвацца. Заўважыла выхавальніца і сказала аб гэтым Раісе Паўлаўне, але тая, педагог з 38-гадовым стажам, не паверыла, пакуль сама не ўбачыла...

— Мне было так балюча... — прызнаецца жанчына. — Разумееце, ён не злодзей, проста трапіў пад чужы ўплыў. Колькі разоў ён мог і грошы ўзяць з дому, але не рабіў гэтага. Тым не менш цяпер у мяне пасяліўся страх. І муж баіцца. А што калі ён возьме ключы ад дома?

Зараз хлопчык бегае да Шпакоўскіх амаль штодня: дом жанчыны блізка ад інтэрната. Сям'я яшчэ не вырашыла, як будаваць з ім адносіны далей.

Раіса Паўлаўна разумее, што з дзецьмі, якія не адчулі любові матулі, цяжка: яны не ведаюць, што такое блізкія адносіны і сваяцкая сувязь. І няма ніякай гарантыі, што калі-небудзь такое дзіця зможа гэта зразумець. Але маленькая надзея ўсё ж застаецца. Дачцэ Раісы Паўлаўны, Аксане, перадалася самае каштоўнае ад матулі — сэрца. Яна таксама працуе ў Капыльскім інтэрнаце. Да яе прыязджаюць дзеці, якія нядаўна яго скончылі і вучацца ў ПТВ. Яна клапоціцца не толькі пра іх душы: раіць, як паступіць у той ці іншай сітуацыі, але і пра целы: падхарчоўвае. «Гэтым дзецям патрэбна якая-небудзь апора, хоць бы і нязначная,» — гаворыць маці Аксаны.

Неабыякавасць дарослых да дзяцей тут заключаецца не толькі ў тым, што яны прыводзяць іх у свае дамы і частуюць хатнімі прысмакамі. Важна, што тутэйшыя педагогі прывучаюць дзяцей, якія аказаліся ў надзвычайнай сітуацыі, да працы. Дзякуючы падтрымцы начальніка Упраўлення адукацыі Мінаблвыканкама Таісы Данілевіч і кіраўніка галандскага фонду «Дзіцячыя дамы Беларусі» Марыі Елізавет Схраверус, пры інтэрнаце створана аграферма. Там дзеці вучацца вырошчваць капусту, агуркі і памідоры. Яны таксама даглядаюць курэй, кароў і іншую жывёлу.

— Гэта не проста ўрокі працы, — тлумачыць Генадзь Мікалаевіч. — А прафесійная падрыхтоўка па спецыяльнасцях: «жывёлавод», «садавод» і «агароднік» для старшакласнікаў. Нават калі нехта з дзяцей не будзе працаваць па атрыманай прафесіі, ім гэта спатрэбіцца ў жыцці, бо большасць будзе жыць у сельскай мясцовасці, дзе неабходна мець сваю гаспадарку.

Дзеці на ферме дапамагаюць з сёмага класа. Пасля дзевятага яны становяцца перад выбарам: ісці ў ПТВ ці атрымаць спецыяльнасць на ферме. У Капыльскім інтэрнаце імкнуцца падысці да гэтага пытання індывідуальна. Калі дзіця фізічна моцнае і дастаткова, на погляд настаўнікаў, сацыялізаванае, то яно, канешне, па жаданню можа ехаць вучыцца ў горад. Калі ж выпускнік кволы і хваравіты, то яго абавязкова пакідаюць давучыцца ў старэйшых класах.

Навучэнцаў вучылішча і тых, хто ўжо працуе, патрануюць яшчэ некалькі гадоў.

— Нярэдка ў нашых дзяцей на месцы працы ці ў вучылішчы ўзнікаюць канфліктныя сітуацыі, — кажа Генадзь Мікалаевіч. — Таму мы заўсёды на сувязі. Напрыклад, у нас пастаянныя кантакты з вучылішчам. Мы даведваемся, як дзіця адаптавалася. У час размовы з кіраўніцтвам узгадняем дзеянні, кансультуем і, калі ёсць патрэба, забіраем дзіця назад і залічваем яго ў дзесяты альбо адзінаццаты клас.

Калі ж у юнака альбо дзяўчыны ўзнікаюць праблемы на працы, то выхавальнік едзе на месца, каб паспрабаваць змяніць сітуацыю. Часам бывае дастаткова проста пагаварыць са сваім былым вучнем.

Зараз у школе рыхтуецца новы праект — «Самастойнае пражыванне». З дапамогай фонду «Дзіцячыя дамы Беларусі» кіраўніцтва школы-інтэрната купіла дом. У планах — пачынаць вучыць дзяцей жыць самастойна з дзевятага класа. Праграму такога навучання падзялілі на тры этапы. Спачатку дзіця будзе жыць самастойна адзін дзень, потым — тры, і нарэшце — шэсць дзён.

— Калі-небудзь ім давядзецца жыць самім, — каментуе дырэктар. — У гэтым доме дзіця само сабе навучыцца гатаваць нескладаную вячэру і памые посуд, само пойдзе ў школу і вернецца дадому. Яно на дзень стане гаспадаром. У першы час там будзе прысутнічаць выхавальнік, але мы плануем, каб потым дзеці вучылі там жыць адзін аднаго.

Для абсалютнай большасці дзяцей-сірот менавіта дарослае жыццё ў «вялікім свеце» становіцца неадольным іспытам, ім цяжка сплануваць свой дзень, грошы, бо ў дзяцінстве за іх гэта рабіла дзяржаўная ўстанова. Калі капыльскі праект «Самастойнае пражыванне» атрымаецца, то, магчыма, будзе знойдзены спосаб выратавання тысяч выпускнікоў школ-інтэрнатаў.

Тут розніца з дзецьмі, якія маюць сем'і, вось яшчэ ў чым. Ніводная нармальная маці не дапусціць, каб яе дзіця, ці то яму ўжо 18, ці 20 гадоў, галадала. А што адбываецца з сацыяльнымі сіротамі, якія пакінулі інтэрнацкія сцены? Яны не ўмеюць размяркоўваць свой бюджэт і тыднямі сядзяць на «ралтоне», пакуль «хуткая» не забярэ з дыягназам «язва страўніка». Пасля выпіскі ўсё зноў паўтараецца. Хатнія дзеці вырашаюць свае праблемы з вучобай, працай і нават грашыма з дапамогай і парадай бацькоў. Дзеці, якія выраслі без бацькоў, апускаюць рукі пры першых жа перашкодах на сваім шляху.

Ужо некалькі гадоў у Капыльскім інтэрнаце стараюцца вырашыць і гэтую праблему. Усімі «праўдамі і няпраўдамі» педагогі шукаюць нават самых далёкіх сваякоў кожнага свайго выхаванца. Яны склалі пісьмо, у якім просяць родных сіраты пры любой магчымасці, нават самай маленькай, у любы зручны час узяць дзіця да сябе на некалькі дзён. Дзякуючы гэтаму, у некаторых гадаванцаў знайшліся і бабулі, і цёткі, і стрыечныя браты і сёстры. Адной дзяўчынцы Марыне знайшлі сястру роднай бабулі і тая стала браць дзяўчынку да сябе на кожныя канікулы.

У той дзень, калі аб гэтым мне расказваў дырэктар, ён прыехаў у Мінск і прывёз васьмікласніка Алеся. Яму таксама знайшлі бабулю. Яна жыве ў Бярэзінскім раёне і прыехала ў Мінск забраць унука.

Дырэктар прызнаўся, што многія сваякі не хочуць сустракацца з дзецьмі. Але ён упэўнены, што варта шукаць нягледзячы ні на што, нават калі ў выніку стане трошкі больш шчаслівым толькі адно дзіця.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**
**Фота аўтара.**
*Капыльскі раён.*

## ЯК ДЫРЭКТАР ВАКЗАЛА ЗАТРЫМАЎ РЭЦЫДЫВІСТА

**Дырэктар віцебскага аўтавакзала Уладзімір Кудзёлка атрымаў падзяку і грашовую прэмію ад міліцыі за тое, што асабіста затрымаў ранейсудзімага, які толькі год таму выйшаў на волю.**

Каля трох гадзін дня на пасадачнай пляцоўцы вакзала ўбачыў Уладзімір, што нейкі грамадзянін выцягнуў з кішэні штаноў другога мабільны тэлефон.

Уладзімір затрымаў злачынцу і здаў яго праваахоўным органам. Высветлілася, што затрыманы — рэцыдывіст, 1952 года нараджэння, які ў мінулым дзевяць разоў адбываў пакаранне ў асноўным за крадзяжы.

У памяшканні РАУС Чыгуначнага раёна Віцебска дырэктар аўтавакзала падчас разводу ў ганаровай абстаноўцы атрымаў падзяку і грашовую прэмію.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# Беспрычынная жорсткасць?..

**Вясковаму жыхару, трэба меркаваць, давядзецца адказаць па закону за тое, што ён расправіўся з... сабакам.**

Гэтае здарэнне адбылося ў адной з вёсак Капыльскага раёна. Паводле даных аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама, 38-гадовы вясковец чамусьці «вызверыўся» на сабаку сталічнага пенсіянера. Паводле папярэдняй інфармацыі, спачатку ён без усякай на тое прычыны збіў палкай няшчасную жывёліну на вуліцы. А далейшыя дзеянні мужчыны і наогул у стане шакіраваць любога: у двары дома, які пустуе, ён расправіўся з сабакам, павесіўшы жывёлу на дрэве. У адносінах да яго ўзбуджана крымінальная справа.

**Ігар ГРЫШЫН.**

З залы суда

# ДУШАГУБ

## Яго крывавыя візіты за паўмесяца загналі ў труну трох чалавек

**На допытах і ў час следчых эксперыментаў аб сваіх злачынных дзеяннях ён расказваў з ахвотай і нават з нейкай весялосцю ў голасе: маўляў, вось які я! І таму цяжка было зразумець мужыка: ці то ўсё гэта бравада, ці то розуму ў яго малавата, бо пры ўсім тым, што ён учыніў, нармальны чалавек так сябе не паводзіў бы. А ў канцы допытаў ён наогул здзівіў следчых, калі папрасіў іх пахадайнічаць перад судом, каб яму далі «вышку».**

Забягаючы наперад, скажам, што калегія па крымінальных справах Гомельскага абласнога суда (вядома ж, без усякага хадайніцтва каго-небудзь, а ўзважыўшы ўсе абставіны справы і ступень небяспекі гэтага злачынцы для людзей) сапраўды прыгаварыла яго да смяротнага пакарання. І тут асуджаны адумаўся і падаў касацыйную скаргу ў Вярхоўны Суд. Маўляў, так, ён вінаваты, але не ў такой ступені, каб пазбаўляць яго жыцця. Вышэйшая судовая інстанцыя краіны была іншай думкі: такіх нягоднікаў, як Віктар Ціхіх, наша зямля не павінна насіць.

...Чалавек без кала і двара, — як кажуць у народзе, гэта ён. У свае пяцьдзесят пяць — халасцяк. Ні жонкі, ні дзяцей. Ні хаты, ні кватэры. Так, нібы пустазелле пры дарозе. Нікому не патрэбны быў у Рагачове. Хоць чаго там: не-не ды і праяўлялі інтарэс да яго некаторыя маладзіцы, спадзеючыся на мужчынскую ўвагу і ласку. Дарэмна спадзяваліся, бо ў жанчынах Віктара Іванавіча больш за ўсё прыцягвала тое, каб яны ставілі яму пляшкі ды падпарадкоўваліся кожнаму яго слову. Калі ж не, пускаў у ход кулакі, і — гуд бай, дарражэнькая.

Праўда, з апошняй кабетай (у далейшым усе прозвішчы дзеючых асобаў зменены) яму яўна не пашанцавала. Моцным «арэшкам» гэта сужыцелька аказалася. Пад яго дудку скакаць не хацела. Таму давялося яе перавыхоўваць. У тым сэнсе, што прыгразіў: у труну заганю. Не прыслухалася. Думала, што проста палохае яе. Ды не, не палохаў, а дзейнічаў. Першым разам са сцізорыкам востранькім такім паганяўся. Другім — у горла ўчапіўся. Задушыць хацеў. Не стала чакаць маладзіца трэцяга разу. У міліцыю заяву аднесла, пасля чаго апынуўся хуліган на лаве падсудных і загрымеў куды трэба за пагрозу забойства. Кабеце ж скрозь зубы прашыпеў: вярнуся — крывёй умыешся.

Пятроўна ведала: ад яго ўсё можна чакаць. Непрадказальны ён. Асабліва калі нажлукціцца спіртнога. Таму адсочвала час, лічыла дні, калі ён зноў павінен з'явіцца ў горадзе. А напярэдадні нават наняла сабе прыватнага ахоўніка. І не памылілася. Бо Ціхіх адразу пазваніў ёй па тэлефоне і пачаў рабіць намёкі на ранейшае сужыцельства, якое (яна была цвёрда ўпэўненая ў гэтым) прынесла б ёй толькі знерваванне. Таму і дала яму, як гаворыцца, ад варот паварот.

Віктар на гэтым не супакоіўся і папрасіў грошай. Але і тут адмова. Тады, злосны ад пачутага, сцяўшы кулакі, ён рушыў да сваёй «крыўдзіцелькі», ды там дзверы яму адчыніў ладна скроены дзяцюк і са словамі «дзядзька, асадзі назад, а то...» грозна бліснуў вачыма. Ціхіх нічога не заставалася рабіць, як хуценька рэціравацца.

У пошуках нейкай надзеі на жыллё ці матэрыяльную дапамогу ён з'ездзіў у Бабруйск, дзе яму нічога не «засвяціла», і вярнуўся назад. Акрылены тым, што ў райвыканкаме яму выдзелілі 24 тысячы рублёў і ўспомніўшы, што ў яго ёсць знаёмыя Зоя Краўцова і Аляксей Цвяткоў, якія былі паміж сабой нейкія родзічы, ён на пяты дзень вызвалення з калоніі набраў спіртнога і заявіўся да іх. Сядзелі, выпівалі, размаўлялі. Потым зноў паўтаралі выпіўку. Тым больш што за дзень да сустрэчы Зоя Сямёнаўна атрымала пенсію.

Адным словам, час праходзіў весела, і Віктар чакаў таго моманту, калі яму прапануюць застацца тут начаваць. Не дачакаўся. Сам спытаў, ці можна. Гаспадыня згодна кіўнула галавой, але Цвяткоў упёрся рогам. У ачмурэлай ад «кампоту» душы ўчарашняга зэка ўсё закіпела, закалацілася, але выгляду ён не падаў і пачаў збірацца, краем вока паглядваючы на Аляксея, які паабяцаў яго правесці. І калі той падняўся з месца, Віктар знянацку абрушыў на яго галаву некалькі ўдараў малатком. Зоя закрычала «Што ты робіш!» і кінулася да яго. Малаток пачаў хадзіць па яе целу. Раз'юшаны бандыт ведаў: сведку забойства пакідаць жывой нельга...

Забойца дапіў віно і як ні ў чым не бывала заваліўся ў ложак. Раніцай памыў малаток, накрыў трупы коўдрамі і ўзяў курс на магазін. І во: пашчасціла — пазнаёміўся там з Андрэем Кругалёвым. Выявілася, што той вярнуўся нядаўна з лячэбна-працоўнага прафілакторыя і навёрстваў упушчанае. Ці ж не дружбакі яны? Хобі ў іх адно — выпіўка. А ў Кругалёва ж і жыллё маецца. Прытулак там і яму, Віктару, знойдзецца. Дык як жа не замачыць гэта?

Карацей кажучы, Ціхіх пасяліўся ў Кругалёва. Работу пастаянную ён не шукаў, бо хацеў на ўсе сто нацешыцца свабодай, але такія-сякія заробкі ў яго былі. Іншая справа, што ўсе іх ён пускаў на выпівоны ды закусь. Між тым, у Кругалёва збіраліся падобныя на яго, і там час ад часу на вядомай глебе ўзнікалі і спрэчкі, і бойкі. Аднойчы і ён, Ціхіх, атрымаў ад аднаго маладога хлопца такога «ляшча», што ў вачах пацямнела. А што здарылася праз паўмесяца пасля выхаду Віктара на волю, зараз цяжка сказаць. Бо ніводнага сведкі, які мог бы расказаць пра ўсё, няма. Ціхіх жа і на папярэднім следстве, і на судзе апавядаў аб забойстве Кругалёва па-рознаму. Спачатку — што ён абараняўся ад Андрэя, які нібыта напаў на яго з кухоннай сякеркай, затым — што той быццам прадаў яго шапку, за што і развітаўся з жыццём.

Труп Кругалёва ў яго кватэры знайшла нявестка, калі прыйшла туды і ўбачыла ў ванным пакоі размаляванага ўсемагчымымі татуіроўкамі мужыка, які прымаў душ. Перапужаная жанчына хуценька выбегла, замкнуўшы кватэру. Міліцыя не прымусіла сябе чакаць.

Забойства Андрэя Кругалёва Ціхіх, які ў час учынення злачынства быў пры поўнай памяці, на судзе тлумачыў тым, што той, маўляў, быў дрэнным чалавекам. А вось Краўцову і Цвяткова яму шкада...

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

## Сёння

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.38 | 21.41 | 17.03 |
| Віцебск — | 4.19 | 21.39 | 17.20 |
| Магілёў — | 4.28 | 21.31 | 17.03 |
| Гомель — | 4.34 | 21.18 | 16.44 |
| Гродна — | 4.55 | 21.55 | 17.00 |
| Брэст — | 5.05 | 21.46 | 16.41 |

### Імяніны

***Пр.** Ісака.*
***К.** Антаніны, Леакадзіі, Яніны, Андрэя, Ануфрыя, Лявона, Яна.*

### Месяц

***Маладзік 15 чэрвеня. Месяц у сузор'і Цяльца.***

По звестках Нацыянальнага навукова-даследчага цэнтра маніторынгу азонасферы БДУ

**Прагнозныя значэнні УФ-індэкса для г. Мінска і Мінскай вобласці на 12.06.2007**

Для бязвоблачнага неба — UV INDEX 6,5

З улікам прагназуемай воблачнасці — UV INDEX 6,5

- Экстрэмальны ......... 11+
- Вельмі высокі ....... 8—10
- Высокі .................... 6—7
- Умераны ................. 3—5
- Нізкі ........................ 1—2

З **11** да **15** гадзін дня час бяспечнага знаходжання на сонцы для людзей з адчувальным тыпам скуры — **15 мінут**.

## Надвор'е на заўтра




**Няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў**

## ...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА | +22 — +24 °С | |
| ВІЛЬНЮС | +26 — +28 °С | Без ападкаў |
| КІЕЎ | +27 — +29 °С | Без ападкаў |
| МАСКВА | +25 — +27 °С | Без ападкаў |
| РЫГА | +17 — +19 °С | |
| С-ПЕЦЯРБУРГ | +22 — +24 °С | Без ападкаў |

**УВАГА!**
**13 ЧЭРВЕНЯ З 0.00 ДА 11.30**
**НЕСПРЫЯЛЬНЫ ЧАС!**

## 12 чэрвеня

*Дзве даты*

**1815 год** — дзякуючы інтрыгам банкіра Натана Ротшыльда лонданская газета «Морнінг кронікл» паведаміла аб паражэнні Напалеона пры Ватэрлоо (за некалькі дзён да таго, як сама бітва адбылася). Ротшыльд удала сыграў на паніцы, скупіў мноства акцый, стаўшы мільянерам.



**1592 год** — у Баркулабаўскім летапісе ўпершыню згадваецца горад Крычаў. 23 жніўня 1633 года кароль польскі Уладзіслаў IV падарыў гораду магдэбургскае права, пячатку і герб — на чырвоным полі залаты крыж і сярэбраны меч. Прывілеі, і гэта асабліва падкрэслівалася ў каралеўскай грамаце, даваліся ў якасці асаблівай міласці караля за вернасць гараджан дзяржаве і мужную абарону горада.

*Цытата дня:*

***«Чалавеку патрэбна два гады, каб навучыцца гаварыць і шэсцьдзесят гадоў, каб навучыцца трымаць язык за зубамі».***
**Ліён Фейхтвангер (1884—1958), нямецкі пісьменнік.**

## Усміхнёмся!

**З адэскіх назіранняў.**
**Надпіс, выдрапаны на спінцы трамвайнага крэсла: «Усе мужыкі — падманшчыкі і прытворшчыкі!»**
**Крыху ніжэй дабаўлена: «Вы, Розачка, таксама не анёл!»**

☺

Мужык у раддоме глядзіць праз шкло і нешта замілавана мармыча. Потым штурхае свайго сябра пад бок:
— Глядзі — усміхаецца, усміхаецца!
Сябар:
— Дык ён жа на цябе нават не глядзіць!
Мужык:
— Ды я пра медсястру кажу!

☺

**Прыемная нечаканасць: аўтобус з удзельнікамі «Дома-2» зваліўся з моста на цеплаход «Аншлага».**

☺

Да прадаўца падыходзіць жанчына і просіць узважыць пакет. Той пытаецца:
— Тут кіло дзвесце. А што там у вас?
— Два кілаграмы мяса, што я купіла ў вас паўгадзіны таму.

☺

**— Чаму генералы ніколі не бегаюць?**
**— Таму што ў мірны час гэта выклікае смех, а ў ваенны — паніку.**

## Беларускія медыкі рэкамендуюць пры выездзе на дачу браць з сабой аптэчку

У разгар дачнага сезона медыкі раяць усім садаводам-аматарам быць вельмі ўважлівымі да свайго здароўя. Асабліва гэта датычыцца людзей з хранічнымі і сардэчна-сасудзістымі захворваннямі, а таксама пажылых і дзяцей, адзначыла намеснік начальніка ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Людміла Жылевіч.

Паводле яе слоў, праблемы са здароўем у дачнікаў, сярод якіх вялікая колькасць пажылых людзей, узнікаюць таму, што яны спрабуюць на працягу трох летніх месяцаў выканаць вялікі аб'ём работ, нераўнамерна размяркоўваючы свае сілы. Негатыўны ўплыў аказвае таксама спякотнае надвор'е. Таму нават цалкам здароваму чалавеку, які не прывык да моцных фізічных нагрузак, не варта забываць аб тым, што іх працяглასць павінна быць невялікай, з абавязковымі перапынкамі на адпачынак. Не рэкамендуецца працаваць на агародзе ў так званыя «небяспечныя гадзіны», калі сонца знаходзіцца ў зеніце (з 12 да 15 гадзін).

Як правіла, у месцах, дзе размяшчаюцца дачы, адсутнічаюць медыцынскія ўстановы, няма аптэчнай сеткі, а пры ўзнікненні «пазаштатнай» сітуацыі брыгадзе хуткай дапамогі бывае цяжка ў кароткі тэрмін дабрацца да месца. «Таму ў першую чаргу з сабой на дачу варта захапіць індывідуальную аптэчку», — парэкамендавала суразмоўца.

У аптэчцы павінны быць перавязачныя і кроваспыняльныя сродкі, абязбольвальныя прэпараты, антысептыкі і лекі, якія дапамогуць вам пазбегнуць непрыемных наступстваў у сувязі з абвастрэннем хранічных захворванняў або ўзнікненнем новых.

Людміла Жылевіч адзначыла, што большасць хворых з хранічнымі захворваннямі — гэта пацыенты з сардэчна-сасудзістай паталогіяй. Менавіта яны і выклікаюць асаблівую трывогу медыкаў. Так, у людзей, якія пакутуюць ад артэрыяльнай гіпертаніі, перапады атмасфернага ціску і лішняя фізічная нагрузка могуць выклікаць крытычнае павелічэнне артэрыяльнага ціску, якое пагражае ўзнікненнем інфарктаў або інсультаў. Таму гіпертонікам неабходна захапіць з сабой на дачу прывычныя прэпараты, якія дапамагаюць хутка зняць ціск. У арсенале дачнай аптэчкі пацыентаў з ішэмічнай хваробай сэрца акрамя прэпаратаў, якія яны звычайна прымаюць, абавязкова павінен быць нітрагліцэрын. Ён дапаможа хутка зняць сардэчны прыступ.

«Калі пасля прыняцця неабходных лекаў сітуацыя не нармалізуецца, трэба неадкладна выклікаць «хуткую» або спрабаваць самастойна дабрацца да медустановы, дзе будзе аказана кваліфікаваная дапамога», — сказала спецыяліст.

Выязджаючы на дачу з маленькімі дзеткамі, рэкамендуецца захапіць з сабой проціалергічныя прэпараты, бо расліны, якія цвітуць летам, часта выклікаюць у іх алергію.

Калі дача знаходзіцца побач з вадаёмам, варта ўспомніць пра правілы бяспечных паводзінаў на вадзе. Невыкананне апошніх можа закончыцца пераахаладжэннем, патапленнем, цяжкімі траўмамі пазваночніка, дадала Людміла Жылевіч.

**Марыя ГУЦАЛА, БЕЛТА.**

УТВЕРЖДЕНО
Протокол заседания
Наблюдательного Совета
ОАО "Белинвестбанк"
14.05.2007 № 27

# БЕЛИНВЕСТБАНК

ЗАВЕРЯЮ
Начальник управления ценных бумаг Главного управления по г. Минску Министерства финансов Республики Беларусь
________________В. Н. Омельянович
«05» июня 2007 года

## КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ
## ОБ ОТКРЫТОЙ ПРОДАЖЕ ОБЛИГАЦИЙ ОАО «БЕЛИНВЕСТБАНК» СЕДЬМОГО ВЫПУСКА

Открытое акционерное общество «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк» (Адкрытае акцыянернае таварыства «Беларускі банк развіцця і рэканструкцыі «Белінвестбанк»), зарегистрированное в Национальном банке Республики Беларусь 3 сентября 2001 г. за № 807000028, (место нахождения: 220002, Республика Беларусь, г. Минск, пр. Машерова, 29, телефон (017)289 35 40, факс (017) 289 36 70, e-mail: belbb@belinvestbank.by), объявляет об открытой продаже облигаций седьмого выпуска.

Основными целями деятельности банка являются:
- способствование претворению в действие единой денежно-кредитной политики, проводимой Национальным банком Республики Беларусь и Советом Министров Республики Беларусь;
- оказание финансовой поддержки государственных программ;
- участие в кредитовании региональных программ экономического развития, создающихся новых и модернизирующихся действующих производств, кредитование мероприятий, содействующих развитию предпринимательства;
- осуществление инвестиционных проектов, направленных на создание новых, реструктуризацию и расширение действующих производств, а также содействие повышению уровня конкурентоспособности выпускаемой продукции, осуществлению программных мероприятий по освоению высоких технологий и новых видов продукции;
- извлечение прибыли в интересах акционеров.

К предмету деятельности банка относится:
- банковская деятельность;
- поручительство за третьих лиц, предусматривающее исполнение обязательств в денежной форме;
- доверительное управление драгоценными металлами и драгоценными камнями;
- лизинговую деятельность;
- консультационные и информационные услуги;
- выпуск (эмиссию), продажу, покупку ценных бумаг и иные операции с ценными бумагами;
- иную деятельность, предусмотренную законодательством Республики Беларусь.

**Основные показатели финансово-хозяйственной деятельности банка:**

| Показатели | По состоянию на: | |
|---|---|---|
| | 01.01.2007 | 01.04.2007 |
| Прибыль, млн. рублей | 35 061,1 | 9 929,4 |
| Рентабельность, % | | |
| - отношение прибыли к среднему собственному капиталу | 13,9 | 3,9 |
| - отношение прибыли к средним активам | 2,2 | 0,5 |

Выпуск облигаций осуществляется для привлечения временно свободных денежных средств юридических лиц и направления их на рефинансирование ранее выданных кредитов на строительство, реконструкцию или приобретение жилья под залог недвижимости.

Вид, форма выпускаемых облигаций – дисконтные, именные, в бездокументарной форме (в виде записей на счетах).

Владельцами облигаций могут быть только юридические лица – резиденты и нерезиденты Республики Беларусь.

Облигации седьмого выпуска зарегистрированы в Управлении по ценным бумагам Главного управления Министерства финансов Республики Беларусь по г. Минску 05 июня 2007 г., регистрационный номер 5-200-02-0077.

Объем эмиссии облигаций седьмого выпуска составляет 5 000 000 000 (Пять миллиардов) белорусских рублей. К открытой продаже предлагаются 50 000 (Пятьдесят тысяч) облигаций. Номинальная стоимость одной облигации равна 100 000 (Сто тысяч) белорусских рублей.

Дата начала открытой продажи облигаций седьмого выпуска — **20 июня 2007 г.**

Открытая продажа (размещение) облигаций осуществляется ОАО «Белинвестбанк» (г. Минск, пр. Машерова, 29, Центральный банк) с 20 июня 2007 г. по 19 августа 2007 г.:

— на внебиржевом рынке ежедневно в течение банковского дня на основании договора открытой продажи (размещения) облигаций;

— в торговой системе ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» (далее – биржа) с 1 по 5 число каждого месяца в период открытой продажи (размещения) облигаций — в размере до 10 % от объема эмиссии.

Облигации, не размещенные в торговой системе биржи, могут быть проданы на внебиржевом рынке.

Доходность облигации установлена в размере 13% (Тринадцать процентов) годовых.

Открытая продажа (размещение) облигаций производится по цене продажи, которая рассчитывается по следующей формуле:

$$С = \frac{N \times 365(366) \times 100}{П \times К + 365(366) \times 100}, где$$

С — цена продажи облигаций (белорусских рублей);
N — номинальная стоимость облигаций (100 000 белорусских рублей);
П — доходность, установленная при выпуске (13 процентов годовых);
К — количество дней со дня открытой продажи (размещения) облигаций до наступления срока их погашения. При этом день размещения и день погашения облигаций считаются одним днем.

Денежные средства, направляемые юридическими лицами на покупку облигаций, перечисляются в безналичном порядке на балансовый счет 4940 в Гоперу ОАО «Белинвестбанк», код 739.

Срок обращения облигаций составляет 1 год — с 20 июня 2007 г. по 19 июня 2008 г. включительно.

Обращение облигаций осуществляется в установленном законодательством Республики Беларусь порядке в торговой системе биржи.

Совершение сделок купли-продажи облигаций в торговой системе биржи прекращается за 10 рабочих дней до наступления срока их погашения.

Доходом по облигациям является дисконт, который рассчитывается по следующей формуле:

Д = N – С, где
Д — дисконт (белорусских рублей);
N — номинальная стоимость облигаций (100 000 белорусских рублей);
С — цена облигаций, сложившаяся при их размещении на аукционе, или цена продажи, указанная в договоре открытой продажи (размещения) при их размещении на внебиржевом рынке (белорусских рублей).

Дата погашения облигаций — 20 июня 2008 г.

Погашение облигаций производится владельцам облигаций в день их погашения на основании реестра владельцев облигаций. Реестр владельцев облигаций формируется за 10 рабочих дней до даты погашения облигаций.

При погашении владельцам выплачивается номинальная стоимость облигации в безналичном порядке в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Досрочно облигации банком не погашаются.

Доходы, полученные владельцем облигации Банка от реализации и погашения облигаций, не облагаются налогом на доходы, кроме доходов, полученных от реализации облигаций выше их текущей стоимости на день продажи, в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь «О выпуске банками облигаций» от 28.08.2006 № 537.

Операции, осуществляемые с облигациями, в соответствии с законодательством Республики Беларусь не подлежат особому контролю.

В продаже облигаций может быть отказано в случаях, предусмотренных законодательством Республики Беларусь.

В случае отказа от выпуска облигаций ОАО «Белинвестбанк» в срок не позднее 30 дней с момента принятия решения об отказе, возвращает владельцам облигаций денежные средства, направленные на покупку облигаций, с уплатой процентов за фактический срок пользования денежными средствами по процентной ставке, равной тринадцати процентов годовых.

Исполнение обязательств по облигациям обеспечивается обязательствами физических лиц по возврату основной суммы долга по предоставленным ОАО «Белинвестбанк» кредитам на строительство, реконструкцию или приобретение жилья под залог недвижимости, включенными (включаемыми) в сформированный реестр данных обязательств, ведение которого осуществляет банк в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.

Основная сумма долга по включенным в реестр обязательствам по кредитам, выданным банком на строительство, реконструкцию или приобретение жилья под залог недвижимости, служащих обеспечением облигаций, по состоянию на 01.05.2007 составляет 9 606 633 926 (Девять миллиардов шестьсот шесть миллионов шестьсот тридцать три тысячи девятьсот двадцать шесть) белорусских рублей.

Банк ведет реестр обязательств по кредитным договорам, служащих обеспечением облигаций, и обеспечивает установленный в части второй подпункта 1.1. пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 28 августа 2006 г. № 537 «О выпуске банками облигаций» норматив соответствия объема находящихся в обращении облигаций размеру основной суммы долга обязательств по кредитным договорам.

С проспектом эмиссии облигаций можно ознакомиться в ОАО «Белинвестбанк», его филиалах (отделениях) в течение их рабочего времени, а также на сайте ОАО «Белинвестбанк» www.belinvestbank.by.

Адреса филиалов (отделений) банка и телефоны для справок о продаже облигаций:

г. Бобруйск, ул. Пушкина, 198, тел. (8-02251) 7-31-70
г. Борисов, ул. Орджоникидзе, 55, тел. (8-0177) 73-45-11
г. Брест, ул. Советская, 50, тел. (8-0162) 23-08-36
г. Брест, Катин Бор, 113, тел. (8-01641) 2-35-41
г. Витебск, ул. Ленина, 22/16, тел. (8-0212) 29-75-01
г. Гомель, ул. Советская, 7, тел. (8-0232) 74-11-45
г. Гродно, ул. Мицкевича, 3, тел. (8-0152) 72-02-13
г. Лида, ул. Качана, 9, тел. (8-01561) 3-29-69
г. Минск, пр. Машерова, 29, тел. (8-017) 290-77-23, 289-36-45
г. Минск, ул. Коллекторная, 11, тел. (8-017) 217-30-00
г. Минск, ул. Мельникайте, 2, тел. (8-017) 203-93-96
г. Минск, пр. Партизанский, 6-а, тел. (8-017) 298-33-17
г. Минск, ул. Коржа, 11-а, тел. (8-017) 201-22-44
г. Минск, ул. Одоевского, 6-а, тел. (8-017) 228-25-16
г. Минск, ул. Могилевская, 5, тел. (8-017) 213-17-08
г. Могилев, ул. Первомайская, 29-а, тел. (8-0222) 22-03-35
г. Молодечно, пер. Партизанский, 1, тел. (8-01773) 7-43-16
г. Орша, ул. Ленина, 26-а, тел. (8-02161) 2-42-78
г. Полоцк, ул. Ленина, 37-а, тел. (8-0214) 44-55-33

**Председатель Правления ОАО «Белинвестбанк»** **А.Е. Рутковский**

**Главный бухгалтер ОАО «Белинвестбанк»** **А.Н. Сырокваш**

*Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности № 3 от 27.10.2006 г.*

# АМАЛЬ ТАЯ Ж РАДЫЯЦЫЯ?
## Чаму сонцапёку лепей увогуле пазбягаць

**У мінулыя гады «Звязда» ўжо друкавала звесткі пра УФ-індэкс — дзённы максімум біялагічна актыўнага выпраменьвання, ці інакш кажучы, узровень небяспекі ўльтрафіялетавага выпраменьвання, ад якога залежыць працягласць знаходжання пад адкрытым сонцам. Гэты год — не выключэнне, але нагадаем, навошта аб гэтым патрэбна ведаць.**

— Сонца — асноўная крыніца аптычнага выпраменьвання, паток якога падзяляюць на тры дыяпазоны: бачны, інфрачырвоны і ўльтрафіялетавы, апошні з'яўляецца найбольш небяспечным, — тлумачыць **Мікалай БАРКОЎСКІ, загадчык інфармацыйна-аналітычнага цэнтра маніторынгу азанасферы БДУ.** — Мінімальная шкода: апёкі і заўчаснае старэнне скуры (бо разбурае калаген). Акрамя таго абумоўлівае: захворванне абалонак і ўнутраных асяродкаў вачэй (катаракту, фотакан'юнктывіт), фотатаксічныя і фотаалергічныя рэакцыі, базальна-клетачны і плоскаклетачны ракі скуры, злаякасныя меланомы, на развіццё якіх вялікі ўплыў аказвае інтэнсіўнае апрамяненне незагарэлай скуры, сонечныя апёкі (асабліва ў раннім дзяцінстве). Таксама трэба мець на ўвазе, што ўльтрафіялет валодае кумулятыўнай уласцівасцю: яго небяспечны ўплыў накопліваецца ў арганізме (у чым параўнальны з радыяцыяй) і можа праявіцца праз 10—15 гадоў, а то і больш.

Сёння ў многіх краінах назіраецца павелічэнне колькасці паталогій органаў зроку і скуравых покрываў, асабліва пухлін скуры. Штогадовае павелічэнне колькасці выпадкаў раку скуры ў ЗША складае 3—4 працэнты, смертнасці ад меланом — 6,7 працэнта (у некаторых краінах Еўропы гэты паказчык перавышае 10 працэнтаў).

Сітуацыя ў Беларусі падобная на тую, што назіраецца і ў іншых краінах: за апошнія 10 гадоў у структуры захворвання насельніцтва адбылося павелічэнне выпадкаў раку скуры з 6,3 да 10,4 працэнта ў мужчын і з 10,3 да 16,1 працэнта — у жанчын. Лакалізацыя захворвання для мужчын — на шыі, па выразе майкі і тыльным баку рук, у жанчын — на шчыкалатках. У структуры анкапаталогіі ў мужчын пераважаюць новаўтварэнні ў лёгкіх і страўніку, у жанчын — малочнай залозы.

Абазначаны негатыўны ўплыў аказвае УФБ-выпраменьванне, ад якога нас бароніць азонавы слой атмасферы. І хоць, як сведчыць аналіз спадарожнікавых даных аб сярэднім утрыманні азону ў атмасферы з 1978 г., у апошнія тры гады сітуацыя ў Беларусі стабілізуецца (спусташэнне азонавага слою спынілася), трэба мець на ўвазе, што ў чэрвені—ліпені азону стабільна меней, чым, напрыклад, у красавіку, і ён значна памяншаецца пры павелічэнні тэмпературы.

Фіксуючы стан азанасферы штодня, супрацоўнікі Цэнтра могуць прагназаваць аптымальную працягласць знаходжання пад адкрытым сонцам. Яна залежыць ад велічыні згаданага вышэй УФ-індэкса: ад 0 да 2 азначае малую ступень небяспекі, 3—5 — сярэднюю, 6—7 — высокую, 8—10 — вельмі высокую, 11 і болей — экстрэмальную. Асаблівую ўвагу трэба звяртаць на малых дзяцей, людзей з белай скурай і светлым альбо рыжым колерам валасоў. Пры паказчыку УФІ 6,0 такім людзям (і дзецям) можна прысутнічаць на адкрытым сонцы без абароны не больш за 20 хвілін.

**Як правільна загараць:**

1. для вызначэння патэнцыяльнай небяспекі залішняга ўплыву сонечнага выпраменьвання ўлічвайце інфармацыю пра УФ-індэкс ***(можна знайсці штодня ў «Звяздзе»)***;

2. пазбягайце прамых сонечных прамянёў з 11 да 15 гадзін. У гэты час выкарыстоўвайце абарончыя галаўныя ўборы, больш закрытае адзенне, сонцаахоўныя акуляры (звяртаем увагу, што ад ультрафіялету гарантавана абараняюць толькі са шклянымі лінзамі). Не даводзьце да з'яўлення эрытэмы — пачырванення скуры;

3. перад летнім адпачынкам у цёплых краінах варта падрыхтаваць скуру: наведайце некалькі разоў салярый, але таксама не злоўжываючы (бяспечнага ўзроўню выкарыстання салярыя не існуе) альбо прымайце сонечныя ванны ў «правільныя» часы: з 9 да 11, або пасля 15 гадзін;

4. абавязкова выкарыстоўвайце сонцаахоўныя сродкі, прытрымліваючыся рэкамендацый па іх прымяненню;

5. памятайце, што вада адбівае да 100 працэнтаў сонечнага выпраменьвання, снег — 80, пясок — 20 працэнтаў;

6. пасля купання варта абцерці цела ручніком, бо кропелькі вады выконваюць функцыю лінзы і канцэнтруюць сонечныя прамяні (так з'яўляюцца радзімкі).

**Юлія СІЎЦОВА.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Табліца 1. Класіфікацыя тыпаў скуры па рэакцыі на сонечнае выпраменьванне**

| Тып скуры | Загар | Сонечны апёк | Колер валасоў | Колер вачэй |
|---|---|---|---|---|
| I | ніколі | заўсёды | рыжыя/саламяныя | блакітныя |
| II | часам | часам | светла-русыя | блакітныя/зялёныя |
| III | заўсёды | рэдка | цёмна русыя/каштанавыя | шэрыя/карычневыя |
| V | заўсёды | ніколі | чорныя | карычневыя/чорныя |

**Табліца 2. Неабходны сонцаахоўны фактар крэму для розных тыпаў скуры і рознага значэння UV-індэкса**

| UV індэкс | Тып скуры | | | |
|---|---|---|---|---|
| | I | II | III | IV |
| 1 — 3 | 15 | 12 | 9 | 6 |
| 4 — 6 | 30 | 25 | 15 | 12 |
| 7 — 9 | 50 | 40 | 30 | 20 |
| 10 і больш | 60 | 50 | 40 | 30 |

## На сонцы — 10—20 хвілін

**Падчас знаходжання на сонцы не забывайце пра меры перасцярогі.**

Апёкі выклікаюць ультрафіялетавыя промні тыпу А. Промні тыпу В пранікаюць у глыбіню скуры і шкодзяць ДНК.

Уласная абарона скуры еўрапеек дазваляе ім без боязі знаходзіцца на сонцы ад 10 да 20 хвілін. Усё, што перавышае гэты прамежак часу, асабліва ў самыя спякотныя гадзіны на паўднёвых пляжах, патрабуе дадатковай абароны. Памятайце, што на твары першымі пакутуюць нос і скулы, на целе — ікры і зона дэкальтэ. Удзяліце ім асаблівую ўвагу. Калі вы пайшлі з пляжа з пачырванелай скурай і хворай галавой, не наведвайце яго як мінімум тры дні, а для вяртання аддайце перавагу ранішнім або вячэрнім гадзінам, праводзьце большую частку часу пад тэнтам.

Калі ўздзеянне сонца выклікала ў вас самую сапраўдную алергію, не спяшайцеся падбіраць сродкі для вонкавага лячэння. Гэта павінен зрабіць урач. Можна прыняць антыгістамінную таблетку.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19 (тел./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.

html: www.zviazda.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 34.341. Індэкс 63850. Зак. № 3140. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12